ШТО ХВАЛЮЕ БЕЛАРУСКАЕ СТУДЭНЦТВА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Раней у маладых спецыялістаў не было магчымасці пераразмерковвацца, нават калі наймальнік пастаянна затрымліваў ім выплату заработнай платы. Згодна з новым Палажэннем, парушэнні наймальнікам працоўнага заканадаўства, калектыўнага ці працоўнага дагавора з'яўляюцца падставай для скасавання па патрабаванні маладога спецыяліста працоўнага дагавора і наступнага пераразмеркавання. Калі ВНУ не можа даць выпускніку па той ці іншай прычыне накіраванне на працу, выпускнік атрымлівае права самастойнага працаўладкавання з выдачай адпаведнай даведкі. А паколькі існуе норма аб тым, што наймальнік на працягу двух гадоў пасля заканчэння выпускніком ВНУ абавязаны патрабаваць ад яго або гэту даведку, або накіраванне на працу, з 2008 года ўсім выпускнікам, якія навучаліся за ўласны кошт і не размяркоўваліся, выдаецца даведка аб самастойным працаўладкаванні адзінага ўзору. Варта патлумачыць, што выпускнікі, якія атрымалі права свабоднага працаўладкавання, не атрымліваюць статус маладога спецыяліста і прывілеі, якія гэты статус дае. На жаль, але не атрымліваюць статусу маладога спецыяліста і выпускнікі-платнікі, якія пажадалі размеркавацца. Паводле дзейнага Палажэння, маладым спецыялістам можа быць толькі той выпускнік, які атрымліваў адукацыю за кошт бюджэтных сродкаў і быў размеркаваны. Вельмі хочацца спадзявацца, што гэта несправядлівасць будзе ліквідавана, таму што для арганізацый, якім востра патрабуецца той ці іншы спецыяліст, абсалютна не мае значэння сам выпускнік аплачваў сваё навучанне або за яго гэта рабіла дзяржава. Галоўнае, што ёсць жаданне выпускніка працаваць у прапанаваных яму ўмовах...

— Пасля заканчэння навучання ўсім маладым спецыялістам прадастаўляецца адпачынак працягласцю адзін каляндарны месяц, а выпускнікам педагагічных спецыяльнасцяў — 45 дзён. Гэта не водпуск, а менавіта адпачынак, — падкрэсліла Вольга Мушчынская. — Наймальнік у месячны тэрмін пасля заключэння працоўнага дагавора павінен выплаціць маладым спецыялістам грашовую дапамогу ў памеры месячнай стыпендыі, прызначанай у апошнім семестры. Толькі выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў атрымліваюць грашовую кампенсацыю па месцы навучання. Паколькі многія выпускнікі імкнуцца як мага хутчэй прыступіць да работы, матэрыяльная дапамога выплачваецца ім незалежна ад таго, выкарыстаў малады спецыяліст сваё права на адпачынак ці не. Майце гэта на ўвазе...

Ёсць у маладых спецыялістаў яшчэ адна важная прывілея — яны маюць права на атрыманне льготнага крэдыту на набыццё маёмасці і тавараў першай неабходнасці: такое права даецца выпускнікам дзяржаўных устаноў адукацыі і ўстаноў спажывецкай кааперацыі, якія прыступілі да работы не па месцы жыхарства бацькоў (у іншым населеным пункце) у арганізацыях, што фінансуюцца з бюджэту, у вайсковых часцях, органах унутраных спраў, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях і арганізацыях спажывецкай кааперацыі. Такі крэдыт яны могуць атрымаць на працягу двух гадоў пасля заканчэння навучання.

Вельмі цікавую інфармацыю, якая датычыцца здароўя студэнтаў, агучыла **галоўны інспектар упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Ганна РЫСЯВЕЦ**. Па звестках 33-й сталічнай студэнцкай паліклінікі, нягледзячы на стабілізацыю агульных паказчыкаў захваральнасці, колькасць студэнтаў мінскіх ВНУ, якія стаяць на дыспансэрным уліку па нейкіх захворваннях, павялічылася летась на 5,5 працэнта. Але калі прааналізаваць работу тых ВНУ, якія займаюцца аздараўленнем сваіх студэнтаў, то там прасочваецца выразная тэндэнцыя да зніжэння захваральнасці.

У 2008 годзе санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем былі ахоплены 12 900 студэнтаў і на гэтыя мэты з фонду дзяржаўнага сацыяльнага страхавання было выдзелена 2,6 млрд рублёў. Сёлета мяркуецца выдаткаваць 3,9 млрд рублёў і ахапіць санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем 17 тысяч студэнтаў і навучэнцаў.

Аднак пакуль што для арганізацыі аздараўлення ёсць шмат перашкодаў. Апошнімі дакументамі Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні прадугледжана магчымасць накіравання студэнтаў на аздараўленне без санаторна-курортных картак, вось толькі ў паліклініках цяпер не ведаюць, даведку якога ўзору трэба выдаваць студэнтам для накіравання іх на аздараўленне. Да таго ж зацверджаны Міністэрствам аховы здароўя пералік захворванняў не дае падстаў для выдачы студэнтам пуцёвак для санаторна-курортнага лячэння. Галоўныя ўрачы санаторыяў-прафілакторыяў звярталі ўвагу на тое, што захворванні, пералічаныя ў дакуменце Міністэрства аховы здароўя, звязаны пераважна з узроставымі зменамі, і студэнты яшчэ з-за свайго маладога ўзросту не могуць іх мець. Але галоўнае медыцынскае ведамства не лічыць мэтазгодным пашыраць пералік падстаў для атрымання санаторна-курортнага лячэння. Значыць, студэнтам пакінулі толькі аздараўленне. З 1 лютага 2009 года памер датацыі, якая выдзяляецца для аздараўлення студэнтаў у санаторыях-прафілакторыях ВНУ, складае 8500 рублёў у дзень, з іх на харчаванне накіроўваюцца 7800 рублёў, а выдаткі на заработную плату і налічэнні на заработную плату персаналу складаюць толькі 700 рублёў з агульнай сумы датацыі. Выходзіць, што ў якасці аздараўлення студэнту гарантаванае фактычна толькі ложка-месца ў прафілакторыі плюс харчаванне. Безумоўна, для кагосьці са студэнтаў гэта добрая сацыяльная падтрымка, але ж для паўнавартаснага аздараўлення толькі харчавання яўна недастаткова.

У сярэдзіне сакавіка на адрас сталічных навучальных устаноў (і дзяржаўных, і прыватных), якія не маюць уласных санаторыяў-прафілакторыяў, быў накіраваны ліст з прапановай арганізаваць аздараўленне моладзі ў санаторыі-прафілакторыі БНТУ, які мае цудоўную базу і, што немалаважна, арганізуе падвоз. У Мінску, дарэчы, свае санаторыі-прафілакторыі маюць толькі 6 ВНУ, а па ўсёй краіне дзейнічаюць16 студэнцкіх санаторыяў-прафілакторыяў.

— Пакуль што 100-працэнтная загрузка здраўніцы не забяспечваецца. Вельмі шкада... Напэўна, у студэнцкім санаторыі-прафілакторыі аздараўляцца павінны ўсё ж такі студэнты, а не староннія людзі? — задала рытарычнае пытанне Ганна Рысявец. — Гэта тым больш крыўдна, што ў іншых рэгіёнах пры ўсім жаданні даць студэнтам магчымасць прайсці аздараўленне праблематычна...

Як бачна, на семінары, арганізаваным для актывістаў прафсаюзных арганізацый студэнтаў ВНУ Цэнтральным камітэтам Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, ўзнімаліся вельмі актуальныя пытанні. І, як заўважыў, падводзячы вынікі сустрэчы намеснік старшыні ЦК Раман Дапіра, калі мы з вамі добра ведаем тую ці іншую праблему, гэта яшчэ не значыць, што пра яе ведаюць людзі, ад якіх залежыць прыняцце таго ці іншага рашэння. Таму трэба быць больш настойлівымі ў нашых дзеяннях...

Надзея НІКАЛАЕВА.

ХТО НАКОРМІЦЬ НАВУЧЭНЦА?

Міністэрствам гандлю сумесна з Міністэрствам адукацыі падведзены вынікі конкурсу на лепшую арганізацыю харчавання навучэнцаў устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі за 2008 год. Пераможцамі ў намінацыі «Лепшы гандлёвы аб'ект грамадскага харчавання пры вышэйшай навучальнай установе» сталі гандлёвы комплекс Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, рэспубліканскае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Камбінат грамадскага харчавання» БДУ і аб'яднанне сталовай № 146 Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання. У намінацыі «Лепшы гандлёвы аб'ект грамадскага харчавання пры ССНУ» перамаглі камунальнае гандлёва-вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Орша-Сэрвіс», якое арганізуе харчаванне навучэнцаў Аршанскага дзяржаўнага механіка-эканамічнага каледжа, і структурнае падраздзяленне Слуцкага прафесійна-тэхнічнага каледжа перапрацоўчай прамысловасці.

Ганаровым дыпламам было ўзнагароджана таксама структурнае падраздзяленне «Прадпрыемства грамадскага харчавання» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже объекта недвижимости – здания магазина «Культтовары-хозтовары», расположенного по адресу: Гродненская область, Кореличский район, г/п Мир, ул. Красноармейская, 36а.

Кореличское районное потребительское общество (Продавец) совместно с ЧУП «Белкоопроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят повторный открытый аукцион по продаже объекта недвижимости – здания магазина «Культтовары-хозтовары», расположенного по адресу: Гродненская область, Кореличский район, г/п Мир, ул. Красноармейская, 36а.

Характеристика строения: здание магазина, общей площадью 847 кв. м фундамент бутобетонный, наружные и внутренние капитальные стены – кирпичные, перекрытия железобетонные, кровля рулонная, полы плиточные, внутренняя отделка – штукатурка, отопление – центральное, электроосвещение – скрытая проводка.

Общая площадь земельного участка для содержания и обслуживания недвижимости составляет 0,1664 га, расположенного по адресу: Гродненская область, Кореличский район, г/п Мир, ул. Красноармейская, 36а. Земельный участок предоставлен в постоянное пользование по решению Кореличского районного исполнительного комитета от 26 марта 2007 г. № 213.

Начальная цена снижена на 5 (пять) процентов и составляет – 170 715 493 белорусских рубля с НДС.

Размер задатка составляет 0,1 % от начальной цены, сумма задатка 170 715 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510 МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 09/09 от 25.03.2009 г., без НДС»).

Аукцион состоится **20.04.2009 года в 14.00** по адресу: Гродненская область, г.п. Кореличи, ул. 8 Марта, 28.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.04.2009 г.** включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1211; 1213.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 09/09 от 25.03.2009 г., в том числе НДС 18 %).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 3 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 5-ти банковских дней с даты проведения аукциона.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Право собственности на объект переходит от Кореличского районного потребительского общества к победителю аукциона после полного расчета по договору купли-продажи объекта.

Условия оплаты: 10 банковских дней с даты подписания договора купли-продажи.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 29.11.2008 г. № 226.

Контактные телефоны: в г. Минске 8 (0172) 226 78 84; 226 94 83, в г.п. Кореличи 8 (01596) 2 11 84; 2 17 85; 2 13 85.

«Стыль павінен існці знутры...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Ім падабаецца, што я прыдумаў сабе вобраз, якому імкнуся адпавядаць.

— Ці не падкажаш нашым чытачам, якія тэндэнцыі ў модзе на перыяд «Вясна-лета»?

— Лёгкія, зручныя майкі, кофтачкі яркіх колераў і са смешнымі малюнкамі. Завужаныя джынсы, з нізкай пасадкай, не надта яркія. Вялікія сонечныя акуляры. Гадзіннікі вядомых вытворцаў, таксама вялікія і яркія. Прычым спартыўны стыль больш не ў модзе. Ён адышоў. Таму тыя ж сонечныя акуляры, выкананыя ў спартыўным стылі, ужо не актуальныя. Сёння распаўсюджаны такі стыль, які прыйшоў да нас са Злучаных Штатаў, «Цік-тонік». У нашай краіне ён надта інтэрпрэтаваны. Гэты стыль звязаны з музыкай, што пацвярджае перасячэнне стыляў музычных з адзеннем, з модай. Увогуле, музыка адыгрывае вялікую ролю ў FASHION. Але не спяшайцеся даходзіць да фанатызму. Стыль і чалавек павінны спалучацца.

— Ну і нешта ў якасці пастскрыптума для нашых чытачоў.

— Раю шукаць і знаходзіць сабе індывідуальныя рысы, выяўляць іх. Не бойцеся праяўляць сваю індывідуальнасць, якая ў наш час, на жаль, з'яўляецца прадметам абмеркавання. А тых людзей, якія не баяцца эксперыментаў, якія займаюцца сабой, сваім стылем, трэба паважаць. Я лічу, што чалавек не павінен сябе ў нечым абмяжоўваць. Шукайце — і знойдзеце. Галоўнае — не баяцца пошукаў, якія спрыяюць шырокаму асобаснаму раскрыццю.

Новае пакаленне, акрамя Пепсі, выбірае...

Слушная думка. Мне застаецца толькі дадаць, што Іван мае рацыю. Наш стыль, ці то ў адзенні, ці то ў жыцці, — гэта вынік нашага стаўлення да рэчаіснасці. Калі смеласць яшчэ недзе завалялася ў парахаўніцах, то не нашкодзіць перагледзець свае жыццёвыя пазіцыі, каб вызначыцца, што ўсё ж бліжэй да цела. А самае галоўнае, да душы.

Пра стылі ці то душы, ці то адзення, размаўляла студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

Дзяцей выратавалі з пясчанага кар'ера ў Бабруйску

У службу МНС паступіла паведамленне аб чатырох хлопчыках, якія апынуліся ў лядовым палоне на востраве пасярод затопленага пясчанага кар'ера.

Крыкі дзяцей аб дапамозе пачулі дзяўчаткі, якія звярнуліся да дарослых. Каля 20 гадзін у прыцемках выратавальнікі прыбылі на месца здарэння.

Як паведамілі ў прэс-службе Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС, пясчаны кар'ер размяшчаецца ў раёне вуліцы Гогаля, непадалёк ад гаражнага масіву. Земляны востраў утварыўся ў 20 метрах ад берага. Навокал яго — падталы лёд.

Малыя па лёдзе вельмі хутка дабеглі да вострава, як потым самі растлумачылі — збягалі ад старэйшых дзяцей. Але выбрацца назад ужо не здолелі.

Супрацоўнікі МНС вынеслі хлопчыкаў на бераг на руках: глыбіня кар'ера ў раёне вострава — да 1 метра. Малым аказалі першую дапамогу — расцерлі і захуталі. Малодшаму з дзяцей — 7 гадоў, старэйшаму — 13. Яны правялі на востраве каля 3-х гадзін.

Усю кампанію з дыягназам «пераахаладжэнне» шпіталізавалі ў Бабруйскую гарадскую дзіцячую бальніцу, але цяпер усе хлопчыкі ў здавальняючым стане адпраўлены дадому.

Ілона ІВАНОВА.

ШУКАЮ ПРАЦУ! Дорага!!!

Частка 1. Марныя тэлефонныя званкі і стаптаныя ногі

Долар і еўра ўсё падымаюцца, хлеб у крамах пацiху даражэе — і канца гэтаму не відаць. Эх, што ж тут папішаш — фінансавы крызіс!

І як жа беднаму і без розных крызісаў студэнту выжыць у такі складаны час? Да таго ж, большасці даводзіцца здымаць пакоі і кватэры, таму што месцаў у інтэрнаце на ўсіх не хапае, а аплату за жыллё часцей за ўсё патрабуюць менавіта ў замежнай валюце. Акрамя гэтага, трэба хоць калінікалі есці, ды яшчэ так хочацца часам схадзіць у кіно! Вось і прыходзіцца студэнцікам думаць пра тое, дзе і як можна зарабіць хоць крыху грошай...

Якую ж працу можа знайсці малады чалавек, які амаль нічога не ўмее, кожны дзень сядзіць ва ўніверсітэце ці каледжы, мае ўсяго некалькі гадзін вольнага часу і вельмі-вельмі хоча атрымліваць крыху лішніх рублёў?

Скупляю ўсе рэкламныя газеты, якія былі ў кіёску «Белсаюздруку» (давялося патраціць каля 10 тысяч; аказваецца, гэта не так танна — шукаць працу). Гартаючы газетныя старонкі, можна прыйсці да высновы, што і падчас фінансавага крызісу многім фірмам і арганізацыям патрэбны супрацоўнікі. Здаецца, даволі проста ў сталіцы працу могуць знайсці прадаўцы, кандытары, бухгалтары і вадзіцелі (са сваім аўтамабілем!).

А вось для студэнтаў амаль нічога няма — сур'ёзным фірмам патрабуюцца толькі сур'ёзныя людзі на поўны працоўны дзень. Праз гадзіны дзвемарных тэлефонных званкоў (на якія давялося патраціць яшчэ каля дзесяці тысяч рублёў) стала зразумела, што ні адной арганізацыі на працу не патрэбныя ні студэнты-грузчыкі, ні студэнткі-прыбіральшчыцы.

Адзіны варыянт, які застаўся, — гэта распаўсюджванне рэкламы. За тое, каб раскідаць дзве тысячы рэкламных улётак па паштовых скрынях мірных гараджан, прапаноўвалася ўсяго пяць тысяч рублёў — здаецца, гэтага нават не хопіць, каб аплаціць праезд у тыя месцы, дзе трэба будзе раскідваць гэтыя ўлёткі.

Больш прывабны варыянт — трыццаць тысяч рублёў за тое, каб расклеіць па горадзе тысячу рэкламных абвестак. Здаецца, што тысяча, — гэта не вельмі шмат, таму вырашаю паспрабаваць.

Падчас сустрэчы малады чалавек дае мне тры вялікія пачкі рэкламных абвестак па чатырыста штук у кожнай — у іх таварышы прапаноўваюць якасна і танна паставіць у кватэру новыя вокны.

— Студэнтаў у нас працуе шмат, звычайна расклейваюць па дзвесце-трыста абвестак за дзень, — кажа мне мой наймальнік.

Ну што ж, паглядзім, колькі магу расклеіць я.

Па-першае, я вырашыла пералічыць, ці не памыліліся, калі адлічвалі мне абвесткі. Аказалася, што з кожнай сотняй ляжаць яшчэ чатыры лішнія — нічога сабе, тры пачкі — і 48 лішніх лісточкаў. Не, таварышы, мяне не падманеш! Сумленна дастаю ўвесь лішак і іду працаваць...

Першая сотня разышлася даволі хутка, з другой пачаліся праблемы: у мяне раптам скончыўся клей. Хвілін сорак давялося патраціць на тое, каб знайсці кіёск, купіць запаветную бутэльку і вярнуцца на тое месца, дзе я скончыла працу. На трэцяй сотні я зразумела, што мне сумна, што ногі пачынаюць крыху ныць, а колькасць лісточкаў ніяк не хоча памяншацца. Да таго ж, пачалі нерваваць людзі, якія з цікавасцю сачылі за тым, як я клеіла абвесткі, пасля з цікавасцю іх чыталі і крычалі мне наўздагон нешта абразлівае пра тое, як ім патрэбны новыя вокны. Але, як сапраўдны стаханавец, працягваю швэндацца між дамоў...

Калі пачало цямнець, я вярнулася дамоў і адразу ж звалілася на мяккую канапу. Я страшэнна стамілася, а мой вынік — чатыры сотні наклееных абвестак — зусім не радаваў. Ноччу мне сніліся пад'езды і злыя жыхары дамоў, а назаўтра ногі не хацелі не толькі хадзіць, але і цвёрда стаяць.

Яшчэ некалькі дзён — і разам з сябрамі мне ўдалося-такі расклеіць тысячу абвестак. Забіраючы свае трыццаць тысяч рублёў, я ласкава адмовілася ад новай «партыі».

Што ні кажыце, а гэта — не грошы за стаптаныя ногі, патрачаны дзень і абразлівыя крыкі п'ўп'яных гараджан. Трэба шукаць іншую працу!

Настасся ЛАПЦІК.

УСХОД — СПРАВА ТОНКАЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

У Беларусі Джыу-Джыцу з'явілася ў 1985 годзе дзякуючы Аляксандру Іванавічу Козараву, які сёння з'яўляецца старшынёй «Беларускага Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Джыу-Джыцу» і самаабароны». Галоўная мэта аб'яднання — прапаганда здаровага ладу жыцця праз папулярызацыю Джыу-Джыцу, умацаванне цела і духу, а таксама падрыхтоўка моладзі для службы ў арміі. Набор у групы праходзіць круглы год, прычым залы заўсёды адчыненыя — любы ахвотны можа проста прыйсці і паназіраць за трэніроўкамі. Трэнер групы заўсёды азнаёміць вас з правіламі паводзінаў і бяспекі.

Адрасы трэніравальных залаў, якія дзейнічаюць у Мінску, можна даведацца на афіцыйным сайце БРГА «Джыу-Джыцу і самаабароны» — www.belbudo.com, або па тэлефоне 8 029 333 19 32.

Каратэ

Вельмі складана назваць дакладную дату зараджэння каратэ, бо гэты від адзінаборства, узрост якога налічае па розных звестках больш за 1500 гадоў, уяўляе сабой сінтэз розных усходніх баявых майстэрстваў. Па сутнасці, стваральнікам каратэ (у перакладзе з японскай азначае «пустая рука») з'яўляецца заснавальнік Дзэн-Будызму — Бадхідхарма, які ў пачатку V стагоддзя нашай эры перанёс сваю рэзідэнцыю з Індыі ў Кітай, у манастыр Шаалінь. У манастыры Бадхідхарма правodзіў са сваімі вучнямі розныя трэніроўкі для ўмацавання цела і духу, бо медытацыя манахаў патрабавала шмат сілаў і энергіі. За межы вострава новае баявое майстэрства вынес Гічын Фунакошы — чалавек, які займае асаблівае месца ў гісторыі развіцця каратэ. Фунакошы ўсё сваё жыццё прысвяціў вывучэнню і папулярызацыі каратэ. Менавіта дзякуючы яго намаганням дух і філасофія каратэ, якая, паводле Фунакошы, заключаецца ў пошуках найвышэйшай ісціны (першым чынам праз самаўдасканаленне чалавека) змаглі ўзвысіцца над фізічным бокам адзінаборства. На сёння існуе больш за сто розных стыляў і кірункаў каратэ, што сведчыць аб бесперапынным развіцці гэтага баявога майстэрства.

У Беларусі і СССР аб каратэ ўпершыню даведваліся ў 70-я гады мінулага стагоддзя дзякуючы кіно. Героі японскіх фільмаў уражвалі нашу моладзь сваім унікальным уменнем у адзіночку «разабрацца» з мноствам зладняў. Бурны рост папулярнасці каратэ ў краіне працягваўся каля дзесяці гадоў, калі павялічвалася колькасць секцый, а беларускія каратысты займалі прызавыя месцы на ўсесаюзных спаборніцтвах.

Сёння ў Беларусі дзейнічае каля дзесяці федэрацый каратэ розных стыляў, сярод якіх найбольш аўтарытэтныя: ГА «Беларуская фдэрацыя каратэ» (тэл. 206 66 87), гэтая федэрацыя мае свае секцыі каратэ ў БДУ (клуб «Фудасін» — www.fudosin-minsk.info) і ў БНТУ (www.sk-bntu.boom.ru.), ГА «Кратэ-до Фудакан» (www.saypay.narod.ru, трэніроўкі праходзяць у вучэбным цэнтры «Дзіён», тэл. 8 029 752 49 50), ГА «Сэнке» (www.sanker.org.by, тэл. 8 029 611 79 07).

Айкідо і Дзю-До

У адрозненне ад пералічаных вышэй джыу-джыцу і каратэ, айкідо і дзю-до — гэта больш майстэрства барацьбы, чым нанясення ўдараў, і галоўная ідэя заключаецца ў мінімальным выкарыстанні сілы, а таксама ў павышанай бяспечнасці трэніровак. Асноўныя прыёмы гэтых адзінаборстваў: захопы, кругавыя рухі і кідкі развіваюць каардынацыю і гнуткасць цела, а таксама дазваляюць выкарыстаць сілу суперніка супраць яго самога. Гісторыя айкідо налічвае амаль сто гадоў. У перакладзе з японскай айкідо даслоўна азначае — шлях гармоніі жыццёвай сілы. Марыхеі Уэсіба бачыў у айкідо не толькі фізічныя прыёмы самаабароны, але і маральны шлях у жыцці, гармонію цела і душы.

Рэгулярныя заняткі айкідо і дзю-до дапамогуць справіцца са стрэсам, а таксама пазбавіцца агрэсіі.

Афіцыйнымі прадстаўнікамі айкідо і дзю-до ў горадзе Мінску з'яўляюцца: ГА «Себуайкі» (тэл. 8 029 270 04 45), ГА «Беларуская федэрацыя айкідо» (тэл. 676 53 73), а таксама ГА «Беларуская федэрацыя дзю-до» (тэл. 664 47 77).

Напрыклад, зараз у грамадскім аб'яднанні «Себуайкі» займаюцца каля трохсот чалавек, большая частка з якіх — дзеці і падлеткі. Спецыялісты адзначаюць, што айкідо і дзю-до не патрабуюць вялікай фізічнай сілы, таму падыходзяць для людзей рознага ўзросту і полу.

Аляксандр ПАЛУБІНСКІ.

Крымінал

ТЭРМІН БУДЗЕ НЕ ВІРТУАЛЬНЫМ

Навучэнец каледжа, 21-гадовы жыхар Рэчыцы, атрымліваў, па яго словах, па 500 долараў у месяц з наведвальнікаў парнасайта, які ён сам стварыў. У віртуальнай прасторы малады чалавек размяшчаў парнаграфічныя матэрыялы з выявамі няпоўнагадовых. Яны ж з'яўляліся і на іншых рэсурсах сусветнай павуціны. Супрацоўнікі ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі УУС Гомельскага аблвыканкама сумесна з аддзелам па расследаванні злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій у дачыненні затрыманага ўзбудзілі крымінальную справу. Тэрмін будзе не віртуальным. Па рашэнні суда — ад 3 да 8 гадоў пазбаўлення волі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 5 мая 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Адрес земельного участка	Площадь	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
Лот № 1 пр. Пушкинский (р-н жилого дома № 55)	0,0063 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000005000476	196 000	18 000
Лот № 2 ул.Космонавтов, ост. «ГУ им. Кулешова («Педуниверситет»)	0,0058 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торговых киосков в остановочном павильоне	740100000003005020	177 000	16 000
Лот № 3 б-р Днепровский (р-н мини-рынка)	0,0040 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000004003013	117 000	11 000
Лот № 4 ул. Лазаренко, ост. «Ул. Лазаренко» (от центра)	0,0018 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000003000455	55 000	5 000
Лот № 5 пр.Шмидта (р-н жилого дома № 72)	0,0072 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000005000556	180 000	16 000
Лот № 6 пр. Шмидта (р-н бухгалт. школы)	0,0100 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание павильона-пункта приема вторсырья	740100000005002757	250 000	23 000
Лот № 7 ул. Каштановая, (р-н жилых домов №№ 19в, 21)	0,0122 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание магазина на базе торгового павильона	740100000002004252	313 000	28 000
Лот № 8 б-р Непокоренных (р-н жилого дома № 79)	0,0100 га	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового павильона	740100000005003429	250 000	23 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

1) Заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: Доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда данное юридическое лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.

Индивидуальные предприниматели: Паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Граждане – паспорт, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Граждане, индивидуальные предприниматели, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой.

3) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

4) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельного участка победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма расходов составляет 7 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 25.04.2009 года до 16.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ за 2008 год

ОАО «МАГАЗИН «ДАРЬЯНА»

220028 г. Минск, ул. Маяковского, 164, УНН 101083289

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2009 г.

млн руб.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства			
первоначальная стоимость	101	274	255
амортизация	102	129	125
остаточная стоимость	110	145	130
Итого по разделу I	**190**	**145**	**130**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	83	121
В том числе сырье, материалы и другие активы	211	8	10
готовая продукция и товары для реализации	215	73	110
расходы будущих периодов	218	2	1
Налоги по приобретенным активам	220	11	10
Дебиторская задолженность	240	0	4
поставщиков и подрядчиков	242	0	3
прочая дебиторская задолженность	243		1
Денежные средства	260	30	15
Итого по разделу II	**290**	**124**	**150**
Баланс	**300**	**269**	**280**

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	58	58
Добавочный фонд	430	70	70
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	1	1
Итого по разделу III	**490**	**129**	**129**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	34	38
Кредиторская задолженность	620	106	113
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	87	96
по оплате труда	623	7	8
по налогам и сборам	625	9	7
по социальному страхованию и обеспечению	626	3	2
разных кредиторов	537	0	0
Итого по разделу V	**690**	**140**	**151**
Баланс	**700**	**269**	**280**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01.01. 2008 г. по 31.12. 2008 г.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	2435	2127
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	300	257
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	2135	1870
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	1810	1590
Расходы на реализацию	050	326	275
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050)	060	-1	5
3. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	7	1
Налоги, включаемые во внереализационные доходы	131	—	—
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	7	1
Внереализационные расходы	150	3	2
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	4	-1
Прибыль (убыток) за отчетный период	200	3	4
Налог на прибыль	250	1	1
Налоги, сборы и платежи из прибыли	260	2	2
Чистая прибыль (убыток)	300	0	1